





ВАСІЛЬ ШАРАНГОВІЧ
ВАСИЛИЙ ШАРАНГОВИЧ
VASIL SHARANGOVICH

МІНСК
«БЕЛАРУСЬ»
2018

УДК 75(476)(084.1)
ББК 85.143(4Беи)я6
Ш25

Аўтар тэксту і ўкладальнік Н. В. Шаранговіч

У выданні выкарыстаны фотарэпрадукцыі
з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь
і з асабістага архіва В. П. Шаранговіча

*Выданне ажыццёўлена па заказе і пры фінансавай падтрымцы*
*Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

*На вокладцы:* ілюстрацыя да паэмы Я. Купалы «Гусляр». 1978. Каляровая аўталітаграфія
*На обложке:* иллюстрация к поэме Я. Купалы «Гусляр». 1978. Цветная автолитография
*On the cover:* an illustration to the poem of Y. Kupala «Gusla player». 1978. Colored autolithography

*На авантытуле:* Галінка яблыні. Фрагмент. 1969. Акварэль
*На авантитуле:* Ветка яблони. Фрагмент. 1969. Акварель
*On the foretitle:* A branch of an apple tree. Fragment. 1968. Water color

Ш25 **Васіль** Шаранговіч = Василий Шарангович = Vasil Sharangovich : фотаальбом / аўт. тэксту і ўкладальнік Н. В. Шаранговіч. — Мінск : Беларусь, 2018. — 143 с.

ISBN 978-985-01-1239-2.

Выданне прысвечана творчасці народнага мастака, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Васіля Шаранговіча, выдатнага майстра станковай і кніжнай графікі. У творчым багажы В. Шаранговіча — эпічныя творы, кніжныя ілюстрацыі, пейзажы і партрэты. Працуе мастак і ў станковай графіцы, дзе шырока выкарыстоўвае нацыянальныя матывы, сімволіку і метафару.

**УДК 75(476)(084.1)**
**ББК 85.143(4Беи)я6**

**ISBN 978-985-01-1239-2**

© Шаранговіч Н. В., укладанне, тэкст, 2018
© Афармленне. РУП «Выдавецтва «Беларусь», 2018

## СААЎТАР ЭПОХІ

Народны мастак Беларусі Васіль Пятровіч Шаранговіч увайшоў у аналы мастацтва XX стагоддзя як выдатны майстар станковай і кніжнай графікі з адметным творчым почыркам. У графіцы яскрава выявіліся яго асаблівае мастацкае мысленне, пачуццё лініі, формы. Несумненнай заслугай Васіля Шаранговіча з'яўляецца пераўвасабленне гравюры ў самастойную галіну нацыянальнай мастацкай культуры, стварэнне беларускай школы графікі.

Вывучаючы работы мастака розных гадоў, прадстаўленыя ў шматлікіх айчынных і замежных музеях, фондах, а таксама тыя, што захоўваюцца ў яго майстэрні, можна ў поўнай ступені ацаніць моц не толькі яго таленту, але і асобы. Валявы, тэмпераментны, дзейсны, ён напаўняў свае графічныя лісты энергіяй, якую чэрпаў з гісторыі і падзей сучаснай яму эпохі. Гэтая энергія кожнага яго твора зачароўвае і сёння. Нават так: сёння, як ніколі раней. Працуючы над падборам матэрыялаў для альбома, я не пераставала здзіўляцца: і гэта той хрэстаматыйны, «афіцыйны» народны мастак, якім усе прывыклі яго ўспрымаць?.. Араты, нястомны ў сваёй працаздольнасці, які ўпэўнена вядзе сваю лінію ў мастацтве? А можа, ён так да канца і не быў раскрыты гледачамі? Як экспрэсіяніст, нястрымана-эмацыйны па манеры, які імкнецца да вострых колеравых кантрастаў і рэзкіх зрушэнняў прасторы, як чалавек тонкі і лёгкаранімы, не схільны да рамантычных слоў, але, па сутнасці, рамантык, які мысліць вялікімі катэгорыямі і паняццямі і ў той жа час умее замыкацца ў самай камернай лірыцы? Бо праз шырокае эпічнае кола сучасных тэм і вобразаў ён здолеў прыйсці да засяроджанага ўсхваляванага асабістага перажывання і пачуцця. «Ісціны ў мастацтве самі па сабе не з'яўляюцца, яны спасцігаюцца ў працы» — гэта была яго ўнутраная пазіцыя, выпакутаваная і шчырая.

Паўнапраўны сааўтар эпохі, ён заўсёды быў на дзіва пільным і дакладным мастаком. Пры больш блізкім разглядзе яго работы набываюць зусім новае гучанне і поліфанічнасць, а кожны фрагмент можна разглядаць як самастойны твор, гэтак жа старанна прапрацаваны і кампазіцыйна бездакорны. Гэтае адчуванне хацелася данесці да чытача, прадстаўляючы ў альбоме невядомыя гледачу работы, эскізы і накіды, часопісныя і кніжныя ілюстрацыі цалкам, а таксама павялічанымі фрагментамі, прыцягваючы ўвагу да найбольш цікавых дэталяў, або, наадварот, паменшанымі, аддаляючы іх і фарміруючы асаблівы напрамак погляду на работы мастака, і, выкарыстоўваючы магчымасці сучаснай паліграфіі, перадаць дух жывога твора.

Творчасць Васіля Шаранговіча фарміравалася ў 1970—1980-я гады ў перыяд пошуку дзейснай зваротнай сувязі мастацтва з соцыумам. Фарматворны патэнцыял жывапісу здаваўся недастатковым, і яго роля перайшла да відаў мастацтва, больш цесна звязаных з запытамі грамадства (графіка, плакат, фатаграфія, архітэктура, дызайн). Выпадкова выбраўшы графіку пры паступленні ў інстытут, Васіль Шаранговіч палюбіў яе пластычную мову за вастрыню перадачы вобразаў і магчымасць свабодна працаваць з формай, лініяй, плямай, кампазіцыяй. Зрэдку, пазней ужо, ён вяртаўся да жывапісу, якім сур'ёзна займаўся яшчэ ў мастацкім вучылішчы, але і ў нешматлікіх жывапісных палотнах, якія не маюць непасрэдных прататыпаў у яго графічных работах, няцяжка заўважыць рысы «графічнага мыслення», уплыву мастацкіх сродкаў і прыёмаў гэтага мастацтва на жывапіс. Гэта адчуваецца ў дакладнасці контураў, у выразным падзеле фарбаў, у кантрастах сілуэтаў фігур і фону, ва ўмоўнасці плоскай пабудовы прасторы і выразнай графічнасці дэталяў.

У лінагравюрах і аўталітаграфіях, манатыпіях, акварэлях ён здолеў спалучыць высокую класічную традыцыю, характэрную для мастацтва таго часу, з метадамі авангарднага формаўтварэння. У праграмных графічных серыях, створаных паводле твораў Я. Купалы, Я. Коласа, А. Міцкевіча, М. Багдановіча, выяўлялася мадэлюючая функцыя — абагульненае ўяўленне пра сучаснасць, стварэнне «карціны свету» — не толькі за кошт актуальнасці тэмы, але і з дапамогай новага бачання, вострых фармальных вырашэнняў.



У станковых работах Васіль Шаранговіч актыўна выкарыстоўваў такі элемент канструктывізму, як мантаж розных планаў (серыя «Памяці вогненных вёсак»), шырока ўжываў магчымасці новай мовы кінематографа і фатаграфіі: фіксацыю непастановачных пластычных станаў, эфект негатыву і «змазанай» формы (ілюстрацыі да зборніка выбраных твораў А. Міцкевіча «Зямля навагрудская, краю мой родны», паэзіі М. Багдановіча, паэмы Я. Купалы «Курган»). Пры гэтым вялікую ролю мастак адводзіў кампазіцыі: нечаканай, пабудаванай на кантрастах, часам на няўстойлівай раўнавазе, «лунанні». Важнай асаблівасцю пластычнай мовы мастака стала эканомія выразных сродкаў пры канцэнтрацыі энергіі ўздзеяння на гледача.

Асаблівую ўвагу Васіль Пятровіч надаваў узаемадзеянню чалавека і прасторы. Калі выява чалавека ў яго адпавядае класічнай норме (авангард ствараў нанава аблічча чалавека), то суадносіны плоскасці і прасторы больш вольныя, пабудаваныя часцей за ўсё прыёмамі мантажу розных па маштабе планаў, што працягвае авангардную ідэю пераадолення гравітацыі ў кампазіцыі, канкрэтызуючы яе ў адпаведнасці з кожнай новай тэматыкай. Ён то карыстаўся лінейным, контурным малюнкам, то рабіў выяўленчую прастору пляскатай, з вывядзеннем персанажаў на «авансцэну» або нават акцэнтуючы іх рух наперад, на гледача, ці накіраванай свабоднымі планамі ўглыбіню.

Новыя вырашэнні формы, рэзкія, смелыя, экспрэсіўныя, былі характэрныя яшчэ для студэнцкіх работ Васіля Шаранговіча. У інстытуце ён лічыўся «фармалістам», але пры гэтым быў выдатным малявальшчыкам, які бліскуча валодаў рознымі кампазіцыйнымі прыёмамі. Не выпадкова дыпломная серыя лінагравюр па матывах твораў Я. Купалы была пабудавана на вобразах у дынаміцы прасторы, вырашанай рэзкімі кантрастамі напружаных ліній і планаў. Для гэтай серыі і ў цэлым для ранніх работ мастака характэрна збліжэнне лінагравюры з ксілаграфіяй: аўтар адмаўляецца ад тону, растушоўкі, падкрэслена супастаўляе чорнае і белае, прыводзіць кампазіцыю ў тую рытмічную сістэму, якая адрознівала менавіта ксілаграфію. Непадатнасць і калянасць матэрыялу ствараюць дадатковую напружанасць вобразаў. Аўтар надае асаблівую ўвагу святлаценю, што стварае аб’ём, рэзка акрэсліваючы фігуры жорсткімі лініямі і выкарыстоўваючы гэта як мастацкі прыём. Увасабляючы сваю задуму, ён пераадольвае любыя цяжкасці выканання.

У аснове пластычнай мовы мастака — лаканічная кампазіцыя, пазбаўленая шматслоўнасці, лакальны колер, лепка аб’ёмаў буйнымі штрыхамі, якая падкрэслівае іх амаль скульптурную манументальнасць, шчыльнасць і цэласнасць. У некаторых работах малады мастак па-майстэрску прымяняе прыёмы мантажу, суадносячы элементы блізкіх і больш далёкіх планаў на адной графічнай плоскасці. Так, у дыпломнай серыі смела сумяшчаюцца кантрасныя элементы: партрэт — з па-майстэрску выразаным ажурам фону і грубым сілуэтным шрыфтам паэтычных радкоў, лінейная перспектыва раллі — з дынамічным, нават злавесным, кругавым рытмам чорных груганоў і ўзбураных аблокаў. Ужо тут закладзена «формула» творчасці будучага мастака: вострая дынаміка кампазіцыі, энергія кожнага малюнка, экспрэсіўная рытміка дэталяў. Адна з асаблівасцей яго мастацкага стылю — уменне даводзіць пластычны вобраз да выразнасці знака, які канцэнтруе важныя і прынцыповыя для мастака ідэі і не толькі здольны існаваць ў кантэксце канкрэтнага твора, але і ў нейкім сэнсе здабывае самастойнае жыццё.

Студэнцкае захапленне фармальнымі вырашэннямі наклала адбітак на ўсю наступную творчасць Васіля Шаранговіча, якая балансавала паміж смелай абстрактнай канструкцыяй кампазіцыйнага мантажу і рэалістычнай фігуратыўнасцю сюжэта, паміж вострай графічнасцю танальна-лінейнага кантрасту і мяккасцю колеравага стану, паміж самакаштоўным станкавізмам і ансамблевай манументальнасцю. Атрымаўшы падчас вучобы грунтоўныя веды ў галіне формы і кампазіцыі, сур’ёзна вывучыўшы спадчыну расійскіх канструктывістаў і іх савецкіх паслядоўнікаў, свабодную графічную мову вялікіх еўрапейскіх майстроў пачатку XX стагоддзя, малады мастак развіў у сабе крытычнае стаўленне да акадэмічных прынцыпаў малюнка, які быў пабудаваны на «аднавокім» успрыманні свету. Ён спрабаваў «суцэльна бачыць, суцэльна ўспрымаць, бачыць і адлюстроўваць рознапрасторавае і розначасовае», як пісаў У. Фаворскі, а значыць, мэтанакіравана і дынамічна ставіцца да рэчаіснасці. На жаль, фонды Акадэміі мастацтваў і архівы самога аўтара не захавалі творы, выкананыя ім падчас вучобы, як, дарэчы, і шматлікія накіды і эскізы позняга часу.

Мастак заўсёды быў вельмі самакрытычны да сябе падчас працы. Ён упарта шукаў дасканалую форму, якая б найбольш поўна раскрыла сэнс твора. Этапы ж яго пошукаў не менш

цікавыя. Часта яны больш вольныя і экспрэсіўныя. У іх ён у поўнай ступені выкарыстоўваў фармальныя падыходы, якімі захапляўся яшчэ ў інстытуце: «эксперыментаваў» з формай, аб'ядноўваў у адну кампазіцыю розначасовыя моманты і стан натуры, мог звесці прастору да некалькіх умоўна дадзеных плоскасцей, знаходзіў падкрэслена штрыхавую мадэліроўку аб'ёму, якая не разбурала плоскасць.

Манументальна-скульптурная лепка фігур і экспрэсіўная пластыка сталі асновай для стварэння выразнага вобраза ў серыі лінагравюр і аўталітаграфій, створаных па матывах твораў У. Маякоўскага, кнігі «Дзесяць дзён, якія ўзрушылі свет» Дж. Рыда, «Маніфеста Камуністычнай партыі» К. Маркса і Ф. Энгельса. У строгім рытме фігур рабочых, якія ідуць на абарону Петраграда, у непахіснай волі і перакананай сіле гэтых людзей заключана магутнае дыханне рэвалюцыйнай рэчаіснасці. Павольны, перарывісты рытм руху толькі яшчэ больш падкрэслівае сабраную, упарадкаваную дынаміку атрада, які ідзе, уносячы ў той жа час напружаны драматычны акцэнт у пластычнае вырашэнне. Месца і час дзеяння пададзены вельмі скупым намёкам, кампазіцыя амаль цалкам вызвалена ад якіх-небудзь лакальных і бытавых прыкмет, і нішто не перашкаджае велічнай гераічнай абагуленасці мастацкага вобраза. Але пры эпічна манументальным ладзе работ іх героі — жывыя людзі, з розным абліччам і характарам, аб'яднаныя настроем і дзеяннем. Гэтаму драматычнаму і разам з тым перакананна спакойнаму пафасу шмат у чым садзейнічае каларыт работ — амаль манахромны, з адлівам металічных водбліскаў. У гэтых серыях, як і ў большасці іншых яго ранніх твораў, асаблівую ролю адыгрываюць выразнасць сілуэтаў, арнаментальны рытм кампазіцыі. У той жа час мастака цікавіла магчымасць падкрэсліць аб'ём на плоскасці: гэта павялічвала экспрэсію і выразнасць вобразаў. Менавіта за такі «канструктывізм» у графіцы Васіля Шаранговіча часта і шмат крытыкавалі выкладчыкі ў інстытуце, але ён упарта ішоў да індывідуальнай мастацкай мовы. Здраджваць свайму асабістаму бачанню было для яго не характэрна...

Асаблівае месца ў творчасці Васіля Шаранговіча займаюць творы 1980-х гадоў. Менавіта ў гэтае дзесяцігоддзе ён стварае работы, у якіх тэма пакут чалавечых набывае падкрэслена велічную і ў той жа час трагічную афарбоўку. Вайна для яго (а ён перажыў яе маленькім у роднай вёсцы) засталася ў памяці не пераможнымі залпамі, а пакутлівым шляхам праз боль і пакуты, страты, голад. Бязрадасным, глухім да чужога няшчасця ўяўляецца мастаку свет, які ён увасабляе ў чарадзе сімвалічных вобразаў у серыях «Памяці вогненных вёсак», «Блакадны рэквіем», «Споведзь сэрца». Пластычная мова гэтых твораў набывае гранічную напружанасць. Вялікае значэнне мастак надае рытмічнай структуры сваіх работ: рэзкаму гучанню ліній, сілуэтаў, колеравых плям. Фармальныя прыёмы, якія ён выкарыстоўвае, выцякаюць з асаблівасцей яго светаўспрымання, падкрэслена трагічнага і эмацыйна аголенага. Рэальныя прадметы, фігуры людзей ператвараюцца ў кантрасныя колеравыя плямы, прастора пазначаецца размеркаваннем сілуэтаў застылых фігур, твары прыпадабняюцца да журботных масак, якія сімвалізуюць чалавечае гора. Аўтар выводзіць адлюстраваныя сцэны за межы прыватнай падзеі, знікае індывідуальная характарыстыка персанажаў. Смутак, які адчуваецца ў постацях і тварах, становіцца сімвалам бязвыхаднай трагедыі. Сваіх герояў аўтар лепіць шырокімі штрыхамі, ствараючы адчуванне важкай аб'ёмнай формы, перадаючы рух фігур, іх жывыя, заўсёды характэрныя павароты і паставы.

Асаблівую экспрэсію вобразам надае павышана-эмацыянальнае гучанне колеру. Колер уводзіцца ў асноўную чорна-белую гаму малюнка такой жа шчыльнай, амаль немадэліраванай, кідкай плямай. Мастак пазбягае ўзаемнага накладвання фарбаў, якое збівае чысціню і яркасць колеру. Менавіта колер становіцца галоўным сродкам драматызацыі вобраза. Яго павышаная актыўнасць, умоўнасць змяняюць штодзённую рэальнасць, надаюць метафарычнае, сімвалічнае значэнне сюжэту. Пранізлівае гучанне чырвонага колеру нараджае пачуццё пакутлівай трывогі, цагляна-карычневы пакідае адчуванне смутку, сіне-зялёны пасяляе надзею.

Напружаная дынаміка прасторы, вырашанай рэзкімі кантрастамі планаў, становіцца ў гэты час адным з характэрных кампазіцыйных прыёмаў ужо вядомага беларускага графіка. Так, у ілюстрацыях да паэмы Я. Купалы «Адвечная песня» — паэтычным фрызе пра жыццё, каханне і смерць — вельмі ўдала выкарыстаны прынцыпы строга прадуманай кампазіцыі, поўнай імклівай дынамікі, з выразна дакладным сілуэтам і ўмоўнай, распластанай прасторай, а галоўнае — з характэрнымі, хоць і абагулена тыпізаванымі чалавечымі вобразамі. У сімвалічных і манументальных вобразах купалаўскай лірыкі асэнсоўваецца жыццё чалавека як драма яго душы. Менавіта ў гэты перыяд пластычная мова мастака набывае выключную сілу. Вобразы, поўныя

















Вокладкі і ілюстрацыі да часопіса «Вясёлка». 1960—1970-я. Акварэль, гуаш
Обложки и иллюстрации к журналу «Вясёлка». 1960—1970-е. Акварель, гуашь
Covers and illustrations to the magazine "Vyasyolka". 1960—1970s. Water color, gouache

## БІЯГРАФІЯ

1939 — нарадзіўся ў вёсцы Качаны Мядзельскага раёна Мінскай вобласці

1955—1960 — студэнт Мінскага мастацкага вучылішча імя А. Глебава

1960—1966 — студэнт Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута (сёння — Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў)

1966—1967 — мастацкі рэдактар выдавецтва «Беларусь»

1967—1972 — выкладчык БДТМІ

1972—1989 — загадчык кафедры графікі БДТМІ

1974 — дацэнт

1975 — адзначаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

1978 — заслужаны дзеяч мастацтваў БССР

1981 — прафесар

1985 — адзначаны бронзавым медалём трыенале «Майданак-85» (Польшча)

1986—1989 — прарэктар па навучальнай рабоце БДТМІ

1986 — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі

1986 — заслужаны дзеяч мастацтваў Польшчы

1989—1997 — рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў

1989 — адзначаны залатым знакам агенцтва «Інтэрпрэс»

1991 — народны мастак Беларусі

1995 — адзначаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

1995 — акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі

1997—2008 — дырэктар Музея сучаснага выяўленчага мастацтва

Удзельнік рэспубліканскіх і міжнародных выстаў з 1967 года. Работы экспанаваліся ў Польшчы, Італіі, Францыі, Грэцыі, Балгарыі, Чэхаславакіі, Даніі, Канадзе, Фінляндыі, Індыі, Сірыі, Бельгіі, Германіі, Кітаі і іншых краінах.

Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, у Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, у музеях Янкі Купалы і Якуба Коласа, у Міністэрстве культуры Расіі, у зборах Беларускага саюза мастакоў і Саюза мастакоў Расіі, у мемарыяльным комплексе «Хатынь», у прыватных калекцыях Італіі, ЗША, Германіі, Тайваня.

Праілюстраваў больш за 70 выданняў, многія з якіх адзначаны медалямі і дыпломамі розных конкурсаў. За ілюстрацыі да кніг атрымаў 15 дыпломаў усесаюзных і 20 рэспубліканскіх конкурсаў, сярод якіх чатыры дыпломы і медалі імя Ф. Скарыны.

## БИОГРАФИЯ

1939 — родился в селе Кочаны Мядельского района Минской области

1955—1960 — студент Минского художественного училища имени А. Глебова

1960—1966 — студент Белорусского государственного театрально-художественного института (сегодня — Белорусская государственная академия искусств)

1966—1967 — художественный редактор издательства «Беларусь»

1967—1972 — преподаватель БГТХИ

1972—1989 — заведующий кафедрой графики БГТХИ

1974 — доцент

1975 — награжден Почетной грамотой Верховного Совета БССР

1978 — заслуженный деятель искусств БССР

1981 — профессор

1985 — награжден бронзовой медалью триеннале «Майданек-85» (Польша)

1986—1989 — проректор по учебной работе БГТХИ

1986 — лауреат Государственной премии Беларуси

1986 — заслуженный деятель искусств Польши

1989—1997 — ректор Белорусской государственной академии искусств

1989 — награжден золотым знаком агентства «Интерпресс»

1991 — народный художник Беларуси

1995 — награжден Почетной грамотой Верховного Совета Республики Беларусь

1995 — академик Международной академии наук Евразии

1997—2008 — директор Музея современного изобразительного искусства

Участник республиканских и международных выставок с 1967 года. Работы экспонировались в Польше, Италии, Франции, Греции, Болгарии, Чехословакии, Дании, Канаде, Финляндии, Индии, Сирии, Бельгии, Германии, Китае и других странах.

Произведения находятся в Национальном художественном музее Республики Беларусь, в Музее истории Великой Отечественной войны и Музее современного изобразительного искусства, в музеях Янки Купалы и Якуба Коласа, в Министерстве культуры России, в собраниях Белорусского союза художников и Союза художников России, в мемориальном комплексе «Хатынь», в частных коллекциях Италии, США, Германии, Тайваня.

Проиллюстрировал более 70 изданий, многие из которых отмечены медалями и дипломами различных конкурсов. За иллюстрации к книгам получил 15 дипломов всесоюзных и 20 республиканских конкурсов, среди которых четыре диплома и медали имени Ф. Скорины.

# СПІС АСНОЎНЫХ РАБОТ

## *Кніжная графіка*

Муравейка І. Сняжынкі-смяшынкі. Мінск: Дзяржвыдат, 1962. Вокладка, тытульны ліст, ілюстрацыі — 48. Туш, гуаш.

Галайдин Е. Сбит над Тильзитом. Мінск: Беларусь, 1963. Супервокладка, пераплёт, разваротны ліст, ілюстрацыі — 16. Папера, гравюра на метале.

Гарэцкі М. Віленскія камунары. Мінск: Беларусь, 1965. Супервокладка, пераплёт, тытульны ліст, франтыспіс, ілюстрацыі — 16. Меларэльефная папера, туш, пяро.

Янка Купала. Паэмы. Мінск: Беларусь, 1966. Ілюстрацыі — 14. Лінагравюра.

Якуб Колас. З майго летапісу. Мінск: Беларусь, 1967. Супервокладка, пераплёт, тытульны ліст, франтыспіс, ілюстрацыі — 11, шмуцтытулы — 2. Лінагравюра.

Джон Рид. Десять дней, которые потрясли мир. М.: Художественная литература, 1967. Ілюстрацыі — 9. Лінагравюра.

Якуб Колас. Вершы. Мінск: Беларусь, 1967. Пераплёт, тытул, ілюстрацыі — 6. Туш, пэндзаль.

Багдановіч М. Збор твораў: у 2-х тамах. Мінск:  Навука і тэхніка, 1968. Пераплёт, разваротны тытул, шмуцтытулы — 6, ілюстрацыі — 6. Лінагравюра.

Барадулін Р. Адам і Ева. Мінск: Беларусь, 1968. Вокладка, тытульны ліст, шмуцтытулы — 2. Меларэльефная папера, туш, іголка.

Бядуля З. Салавей. Мінск: Народная асвета, 1969. Вокладка, тытульны ліст, ілюстрацыі — 9. Манатыпія, шклограф.

Міцкевіч А. Зямля навагрудская, краю мой родны… Мінск: Беларусь, 1969. Супервокладка, пераплёт, тытульны ліст, франтыспіс, ілюстрацыі — 14. Туш, пяро, пэндзаль.

Маякоўскі У. Уладзімір Ільіч Ленін. Мінск: Беларусь, 1970. Супервокладка, пераплёт, тытульны ліст, ілюстрацыі — 10. Аўталітаграфія.

Талстой А. Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна. Мінск: Беларусь, 1971. Пераплёт, форзац, разваротны тытул, ілюстрацыі — 29. Акварэль.

Зборнік вершаў. Зорка Венера. Мінск: Мастацкая літаратура, 1972. Супервокладка, пераплёт, тытульны ліст, франтыспіс. Лінагравюра.

Янка Купала. Паэмы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1978. Супервокладка, пераплёт, франтыспіс, тытульны ліст, ілюстрацыі — 12. Каляровая аўталітаграфія.

Бялевіч А. Споведзь сэрца. Мінск: Беларусь, 1978. Супервокладка, пераплёт, франтыспіс, тытульны ліст, ілюстрацыі — 9. Туш, гуаш.

Янка Купала. Адвечная песня. Мінск: Мастацкая літаратура, 1980. Супервокладка, пераплёт, ілюстрацыі — 12. Каляровая аўталітаграфія.

Міцкевіч А. Пан Тадэвуш. Мінск: Мастацкая літаратура, 1985. Супервокладка, пераплёт, тытульны ліст, франтыспіс, ілюстрацыі — 24, застаўкі — 12. Акварэль.

Караткевіч У. Старыя беларускія хронікі. Мінск: Мастацкая літаратура, 1988. Супервокладка, пераплёт, тытульны ліст, франтыспіс, ілюстрацыі — 5. Аловак.

Міцкевіч А. Пан Тадэвуш. Мінск: Беларускі фонд культуры, 1998. Пераплёт, тытульны ліст, франтыспіс, шмуцтытулы — 3, ілюстрацыі — 36. Акварэль.

Якуб Колас. Новая зямля. Мінск: Беларускі фонд культуры, 2002. Пераплёт, тытульны ліст, франтыспіс, шмуцтытулы — 3, ілюстрацыі — 90. Акварэль.

Якуб Колас. Новая зямля. Мінск: Мастацкая літаратура, 2014. Супервокладка, франтыспіс, ілюстрацыі — 90. Акварэль.

## *Станковая графіка*

Партрэт Ф.Скарыны. 1971. Лінагравюра. 63 × 48
Серыя «Край нарачанскі» (5 аркушаў). 1972—1975. Лінагравюра. 45 × 62, 45 × 49
Смерць Гражыны. 1972. Лінагравюра. 41,5 × 30
Якуб Колас у Люсінскай школе. 1972. Лінагравюра. 40 × 35
Ганчар. 1973. Аўталітаграфія. 47 × 41
Серыя «Блакада» (5 аркушаў). 1974. Аўталітаграфія. 53 × 83
А хто там ідзе? 1976. Аўталітаграфія. 53 × 83
Серыя «Памяці вогненных вёсак» (9 аркушаў). 1979—1985. Каляровая аўталітаграфія. 71 × 41
Трыпціх «Дзе крыўда адвечная спела». 1982. Каляровая аўталітаграфія. 53 × 37,5; 53 × 61
Серыя «Нарачанскія сосны». 1981. Аловак. 29 × 21
Серыя «Блакадны рэквіем». 2004. Папера, аловак, сангіна, гуаш. 71 × 41
Серыя беларускіх краявідаў. 1976—2017. Акварэль

# ВАСІЛЬ ШАРАНГОВІЧ
## ВАСИЛИЙ ШАРАНГОВИЧ
## VASIL SHARANGOVICH

Фотаальбом

*Укладальнік* **Шаранговіч** Наталля Васільеўна

*На беларускай, рускай і англійскай мовах*

Рэдактар *Л. У. Сідарава*
Мастацкае афармленне *А. І. Бужынскай*
Мастацкія рэдактары *А. І. Бужынская, В. Г. Загародні*
Пераклад на англійскую мову *Г. І. Самасейкі*
Тэхнічны рэдактар *С. Л. Печанёва*
Стылістычны рэдактар *Н. Г. Баранава*

12+

Падпісана да друку 24.08.2018. Фармат 60×90 $^{1}/_{8}$.
Папера мелаваная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 18,0. Ул.-выд. арк. 17,3. Тыраж 500 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/4 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь.
http://belarusbook.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск, Рэспубліка Беларусь.